УДК 712.4-025.71

# АБ'ЯДНАННІ АРХІТЭКТАРАЎ У XXI СТАГОДДЗІ

Чабатар Д. А.
*Навуковы кіраўнік – Касцяшоў А.В.*
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт,
Мінск, Беларусь

У Рэспубліцы Беларусь існуе сваё аб'яднанне архітэктараў – Беларускі саюз архітэктараў (БСА). Але, у наш час, гэтае грамадскае аб'яднанне застаецца ў ценю і яго дзейнасць незаўважаная і разам з тым мае адносна малую вагу ў будаўнічай галіне Беларусі. Адгэтуль мяне зацікавіла наступнае пытанне: а ці актуальна ў XXI стагоддзі архітэктарам ствараць свае суполкі, ставіць мэты і дасягаць іх праз тыя ці іншыя падзеі і мерапрыемствы.

Работа займела наступную *мэту*: Вызначыць актуальнасць аб'яднанняў у наш час і паказаць магчымыя спробы выправіць існы стан Беларускага саюза архітэктараў.

Для дасягнення мэты я прайшоў праз наступныя этапы: ***Пошук*** – Знайшоў аб'яднанні архітэктараў у Заходняй і Ўсходняй Еўропе; ***Даследаванне*** – Даследаваў дзейнасць гэтых суполак; ***Падагульненне і прапановы*** – Агляд суполак архітэктараў розных краін з выяўленнем моцных бакоў, якія могуць паспрыяць развіццю БСА.

***Пошук.*** Для параўнання і выяўлення крокаў былі выбраныя краіны з Заходняй, Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы, якія з аднаго боку маюць устойлівую эканоміку, а з іншага боку ⁻ блізкія ў культурным і геаграфічным плане да Беларусі: Велікабрытанія, Германія, Польшча, Расія.

*Велікабрытанія.* Знаходзіцца ў Заходняй Еўропе і мае моцна развіты архітэктурны рух у краіне. Прадстаўлены Каралеўскім Інстытутам Брытанскіх архітэктараў (англ. RIBA – Royal Institute of British Architects). Гэтая арганізацыя займаецца прадстаўленнем і аховай інтарэсаў архітэктурнай супольнасці ў Велікабрытаніі. Галоўная мэта – ствараць лепшыя будынкі і месцы, ўстойлівае асяроддзе. У аснове дасягнення мэты ляжыць:

- інклюзіўнасць,
- этычнасць,
- экалагічная свядомасць і
- супрацоўніцтва.

*Германія.* Мае два асноўных аб'яднанні якія маюць важную ролю ў развіцці будаўнічай галіны ў Германіі: Werkbund (Германскі вытворчы саюз) і Bund Deutscher Architekten (саюз архітэктараў Германіі).

Werkbund. Мае наступныя мэты: стварэнне якаснага, гуманнага асяроддзя. Дамагаецца сваех мэт з дапамогай пэўных мерапрыемстваў:

экскурсіяў, публікацый, выставаў і іншых праэктаў. Дзейнасць скіравана на еўрапейскі узровень.

Але, разам з тым, не з'яўляецца аб'яднаннем толькі архітэктараў, хутчэй гэта межпрафесійная асацыяцыя па вызначанай праграме.

Bund Deutscher Architekten. Буйнешая асацыяцыя архітэктараў Германіі: арганізацыя якая аб'ядноўвае каля 5 000 архітэктараў і горадабудаўнікоў, якія маюць высокі ўзровень валодання сваёй справай, а так жа займаюцца адстойваннем інтарэсаў архітэктурнай галіны ў Германіі.

*Польшча.* Мае адну ўплывовую супольнасць архітэктараў – SARP (Stowarzyszenie Architektów Polskich). Цалкам сфармавалася ў 1934 годзе, да гэтага існавала ў выглядзе некалькіх асацыяцый з рознымі назвамі і спецыяльнасцямі чальцоў. Мае некалькі мэт:

- адлюстраванне дзейнасці польскіх архітэктараў, ахова і ўдасканаленне архітэктурнай прафесіі і адукацыі,
- інвеставанне і стварэнне аптымальных умоў для развіцця архітэктурнай творчасці ды яе абароны,
- кантроль якасці будаўніцтва ў Польшчы.

*Расія.* Архітэктурная супольнасць прадстаўленая найбольш крупным саюзам – Саюзам Архітэктараў Расіі (САР). Засяроджаны на:

- супраэктаванні законаў у сферы архітэктуры,
- прасоўванні маладых архітэктараў на дзяржаўныя ўзнагароды, прэміі і адаптацыі іх ў прафесійным жыцці, а так жа на
- стварэнні якаснага асяроддзя.

***Даследаванне.***

*Вялікабрытанія.* Інстытут RIBA займаецца прадастаўленнем рэсурсаў, навучальных курсаў, а так жа стварэннем выстаў, канферэнцый і мерапрыемстваў для таго каб падтрымліваць развіццё архітэктурнай і будаўнічай галіны ў Злучаным Каралеўстве.

Арганізацыя заснавана на выбарчым працэсе: усё кіраўніцтва выбіраецца чальцамі асацыяцыі. Пры гэтым кандыдаты павінны прадставіць свае праграмы і выбарчыя ўлёткі. Існаванне канкурэнцыі ў асацыяцыі паказвае на актыўнае жыццё арганізацыі, пры гэтым выбары носяць не проста фармальную ролю, а накладваюць адказнасць як на кандыдатаў, так і на чальцоў асацыяцыі.

Інстытут актыўна ладзіць мерапрыемствы звязаныя з архітэктурным жыццём краіны. Сярод апошніх і будучых:

- «Raise the Roof: Building for Change» (англ. «Прыадкрыць дах: будаўніцтва для пераменаў») – даследуе гендарныя, расавыя і імперыялістычныя аспекты жыцця грамадства і іх канкрэтныя ўплывы ў архітэктуры;
- «Leaway working tour with Antoni Palmer» (англ. «Працоўны тур па Лівэю з Антоні Палмерам») – адкрытая экскурсія па аднаму з раёнаў Лондана – Лівэю. На экскурсіі будзе расказана аб архітэктурных інавацыях і тэндэнцыях гэтага раёну;

- «RIBA North West: The visit to Castlefield Viaduct and meeting» (англ. RIBA паўночны захад: Візіт да віадуку Кастлфілд і сустрэча) – архітэктурны форум з магчымасцю праявіць свой талент і дасканаласць).

Сярод іншых асаблівасцяў дзейнасці мае наступныя:

- рэкляма прафесійнай дзейнасці чальцоў-архітэктараў. Замоўнік можа пакінуць заяўку з указаннем канкрэтных пажаданняў, а грамада ў сваю чаргу знойдзе найбольш падыходзячага архітэктара ці бюро;

- асацыяцыя ладзіць пэўныя рэакцыя на падзеі ў прафесійным свеце Брытаніі;

- існаванне канкрэтных мэт і стратэгіі развіцця;

- выбары як важная падзея ў жыцці асацыяцыі. Кандыдат у прэзідэнты размяшчае сваю праграму і план па дасягненні тых ці іншых мэт. Дадзены план размяшчаецца на сайце арганізацыі;

- выданне часопісу.

*Германія.* Werkbund стаў важным элементам у развіцці сучаснай архітэктуры і промысловага дызайну, асабліва ў пачатковым стварэнні школы дызайну Bauhaus. Першапачатковая мэта Werkbund была ўстанавіць партнёрства паміж вытворцамі прадукцыі і дызайнерамі для паляпшэння канкурэнтаздольнасці нямецкіх кампаній на глабальных рынках.

Сярод апошніх мерапрыемстваў:

- Ausstellung: Water Pressure. Gestaltung für die Zukunft (ням. Выстава: Ціск Вады. Праэктаванне для будучыні) – выстава прапаноў па вырашэнні сучасных праблем з забруджваннем і недахопам водных рэсурсаў у свеце;

- Gemeinsam: Leben – Handeln – Gestalten (ням. Разам: жыццё – дзеянне – дызайн) – выстава прысвечаная праэктаванню якое спрыяе сацыяльнай згуртаванасці;

- Werkbundtag 2024 in Saarbrücken «ÜberFormen / transformations» (ням. Веркбундтаг 2024 у Саарбрукіне «аб формах / трансфармацыя») – адбудзецца абмеркаванне актуальнай тэмы: узаемадзеянне культур, стварэнне культур і рэгіянальныя ідэнтычнасці, што з іх узнікаюць;

- Bund Deutscher Architekten. Саюз архітэктараў Германіі. Мае высокі ўзровень дэцэнтралізацыі (няма галоўнага офісу саюза ў канкрэтным горадзе, бо кожны горад мае роўную арганізацыю). На мэце мае стварэнне якаснай прасторы.

Прынцыпы дзейнасці саюза:

- высокая якасць праэктавання і будаўніцтва ў Германіі. BDA аб'ядноўвае прафесіяналаў у сферы архітэктуры і горадабудаўніцтва;

- калегіяльнасць. Чальцы саюзу дзеляцца адно з адным уласным досведам у сферы праэктавання, а так жа трымаюцца высокага ўзроўню прафесійнай этыцы.

Асацыяцыя прытрымліваецца канцэпцыі «горада кароткіх маршрутаў» – горад павінны адпавядаць інтарэсам пешаходаў і кіроўцам экалагічных відаў транспарту (ровары, сродкі персанальнай мабільнасці, грамадскі транспарт).

Адным з кірункаў дзейнасці з'яўляецца вызначэнне стандартаў якасці ў архітэктуры праз шэраг узнагарод і прэмій.

BDA праводзіць шэраг гадавых грамадскіх мерапрыемстваў, такіх як «Berliner Gespräch» (Берлінская дыскусія) і «BDA-Tag» (Дзень BDA), а таксама мноства тэматычных мерапрыемстваў, грамадскіх форумаў і публікацый.

Таксама BDA актыўна займаецца ўзаемадзеяннем з маладымі архітэктарамі праз сферу адукацыі. Гэта праяўляецца ў праграмах уласнага ўніверсітэту, а так жа ў шматлікіх конкурсах для маладых архітэктараў.

BDA так жа мае ўласнае выданне «der architect».

*Польшча.* Stowarzyszenie Architektów Polskich – адно са старэйшых аб'яднанняў архітэктараў у Еўропе. Актыўна ўзаемадзейнічае з Германскім саюзам.

SARP актыўна праводзіць розныя мерапрыемствы, якія ўключаюць канферэнцыі, выставы і конкурсы. Некаторыя з апошніх мерапрыемстваў уключаюць:

- Конкурс на Nagrodę BDA-SARP – адбыўся ў верасні 2023 года ў Берліне.
- Канферэнцыя Polish-Swiss Innovation Day 2023 на тэму «Збалансаваныя будынкі: інавацыйныя метады і тэхналогіі», якая адбылася 4 кастрычніка 2023 года.

Гэтыя мерапрыемствы з’яўляюцца часткай пастаянных намаганняў SARP падтрымліваць і развіваць прафесійныя стандарты ў галіне архітэктуры і горадабудаўніцтва.

*Расія.* Саюз архітэктараў Расіі з’яўляецца агульнарасійскім аб’яднаннем куды ўваходзяць 100 рэгіянальных і 8 межрэгіянальных аддзяленняў. Мэты САР ўключаюць удзел у распрацоўцы законаў у сферы архітэктуры і будаўніцтва, неабходных для гарманічнага развіцця гарадоў і паселішчаў краіны. У сваёй дзейнасці ўключаюць шматлікія праграмы, сярод якіх распрацоўка нарматыўна-прававых актаў, а таксама праграмы ў галіне адукацыі, падтрымка маладых архітэктараў і інш.

За апошні час САР правялі некаторыя мерапрыемствы, сярод якіх як штогадовыя, так і спецыяльныя;

- адным з апошніх мерапрыемстваў стала рэтраспектыўная выстава прац Аляксандра Кудраўцава;

- наступным мерапрыемствам стане выстава «ArchGlass», якое адбылася ў Маскве з 4 па 6 ліпеня.

***Падагульненне і прапановы.*** Галоўным падабенствам усіх саюзаў з'яўляецца актыўная пазіцыя і ў архітэктурным жыцці краіны. Так жа суполкі маюць пэўны пералік падобных аспектаў, якія робяць жыццё асацыяцый актыўным:

1. Усе асацыяцыі маюць дакладную мэту і зразумелыя задачы, якія ў сваю чаргу замацаваныя ў статуце аб'яднанняў.

2. Правядзенне мерапрыемстваў шырокага віду (выстаў, лекцый, воркшопаў і інш.) на актуальныя тэмы.

3. Здзяйсненне адукацыйных праграм для маладых чальцоў і архітэктараў.

4. Выдавецкая дзейнасць – выданне тэматычнай літаратуры і часопісаў.

5. Актыўная інтэграцыя і прасоўванне маладых архітэктараў у прафесійнае жыццё.

6. Супрацоўніцтва паміж саюзамі (SARP – BDA).

***Што можна падглядзець і прапанаваць?***

1. Актыўная дзейнасць. У нашага саюза есць супольнасць з чальцоў з вялікім досведам, якія могуць дзяліцца гэтым досведам з маладымі архітэктарамі. Так жа актыўная дзейнасць можа і павінна пашырацца за кошт конкурсаў, выстаў на самыя розныя тэмы.

2. Інтэграцыя моладзі. Важны аспект – гэта інтэграцыя студэнцкай супольнасці ў жыцце саюза. Але разам з тым выпадае сярэдні пласт беларускай архітэктуры – гэта сучасныя, прыватныя архбюро. Гэта хутчэй праблема адсутнасці ў камунікацыі паміж рознымі пакаленнямі: паміж саюзам – студэнтамі – моладзі.

3. Выдавецтва. Друк часопісаў па архітэктуры Беларусі і свету, ну і канешне тэматычнай літаратуры.

4. Дэцэнтралізацыя. Стварэнне моцных рэгіянальных суполак архітэктараў.

У XXI стагоддзі аб'яднанні архітэктараў захоўваюць сваю моц і неабходнасць, што дазваляе з аднаго боку прафесійна расці, а з іншага больш эфектыўна ўплываць на архітэктурнае жыццё краіны. Гэта ж выяўляе перспектывы росту для БСА. А дацягнуцца да перспектыў можна з дапамогай мер, пералічаных вышэй: 1) актыўнай дзейнасці, 2) інтэграцыі моладзі, 3) выдавецтва, 4) дэцэнтралізацыі.

*Крыніцы:*

1. Галоўная старонка Deutscher Werkbund. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступа: https://www.deutscher-werkbund.de/ Дата доступа: 13.06.2024

2. Галоўная старонка Royal Institute of British Architects. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступа: https://www.architecture.com/ Дата доступа: 13.06.2024

3. Галоўная старонка Bund Deutscher Architekten. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступа: https://www.bda-bund.de/ Дата доступа: 13.06.2024

4. Галоўная старонка Stowarzyszenie Architektów Polskich/ [Электронны рэсурс] – Рэжым доступа: https://www.sarp.pl/kat/o_sarp,8 Дата доступа: 13.06.2024

5. Галоўная старонка Саюза Архітэктараў Расіі/ [Электронны рэсурс] – Рэжым доступа: https://uar.ru/?ysclid=lxgla07pgr145298293 Дата доступа: 13.06.2024